



№2 - 2020

# ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАДУ ПРАЕКТАЎ ЯК ДЗЕЙСНЫ СПОСАБ У АРГАНІЗАЦЫІ ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ



***І.А. Камарова,***
*выкладчык беларускай мовы і літаратуры*
*установы адукацыі “Баранавіцкі дзяржаўны*
*прафесійны ліцэй машынабудавання”*

**Анатацыя.** У артыкуле прадстаўлены вопыт выкарыстання метаду праектаў у арганізацыі даследчай дзейнасці. Менавіта дадзены тып праекта па дамінуючай дзейнасці (даслечы – творчы – гульнёвы – інфармацыйны – практыка-арыентаваны) набліжаны па структуры да навуковага, што саарыентавана на развіццё ў навучэнцаў III ступені навучання даследчай кампетэнцыі ў выніку самастойнай паэтапнай работы.

**Ключавыя словы:** высокі ўзровень актыўнасці і самастойнасці ўдзельнікаў праекта, добраахвотны ўдзел у праекце, зацікаўленасць у атрыманні выніку праекта, значымая для навучэнцаў праблема, тэма.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі прад’яўляе да прафесіянальнай школы асаблівае патрабаванне, разглядаючы яе, як узровень асноўнай адукацыі, які накіраваны на развіццё асобы навучэнца, яго прафесіянальнае станаўленне [1].

У дваццаць першым стагоддзі выкладчыку неабходна знайсці падыход да сучасных навучэнцаў. Таму абавязак сучаснай навучальнай установы – узяць адказнасць за іх фарміраванне. Галоўнай мэтай сучасных устаноў адукацыі, якія працуюць са старэйшымі падлеткамі, павінна стаць мэта – развіваць якасці старэйшых падлеткаў як суб’ектаў даследчай дзейнасці. Аб’ёмы навучальнага матэрыялу, высокія патрабаванні да сучаснага навучэнца і выкладчыка падштурхоўваюць педагога да пошуку інавацыйных форм дзейнасці, інтэрактыўных метадаў, у тым ліку і да прымянення праектаў [2].

Метад праектаў становіцца ўсё больш папулярным, як за межамі краіны, так і ў Беларусі, што тлумачыцца яго накіраванасцю на развіццё здольнасцей, пазнавальных патрабаванняў і матываў навучэнцаў. Сутнасць праектнага навучання складаецца ў авалодванні навучэнцамі новымі ведамі і спосабамі дзейнасці, развіцці мыслення ў працэсе рашэння вызначанай значнай для навучэнцаў праблемы. Праектнае навучанне спрыяе

развіццю мыслення, здольнасці прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць, што дасягаецца за кошт уключэння навучэнцаў у дзейнасць, якая мае праблемны характар і патрабуе давызначэння ўмоў, вырашэння цяжкасцей, выбара з альтэрнатыў.

Выкладчык пры арганізацыі праектнага навучання дапамагае навучэнцам у пошуку неабходнай інфармацыі, каардынуе работу ўдзельнікаў праекта, падтрымлівае і заахвочвае іх, падтрымлівае абаротную сувязь. Ступень яго ўдзелу вагаецца ў залежнасці ад тыпу праекта і стадыі яго выканання.

І калі на ІІ узроўні навучэнцы атрымлівалі толькі навыкі ў выкарыстанні некаторых элементаў даследчай дзейнасці, то ў старэйшых класах адбываецца развіццё даследчай кампетэнтнасці. І хоць пэўнага ўласнага навуковага адкрыцця ў іх не адбываецца, нельга рабіць вынік, што выкладчык і навучэнцы не зрабілі пэўных адкрыццяў. Плануючы работу па той ці іншай праблеме, навучэнец(цы) атрымлівае(юць) канчатковы вынік, заснаваны на яго(іх) уласнай інтэпрэтацыі атрымнага матэрыялу.

У сваёй педагагічнай дзейнасці кіруюся аптымістычнай канцэпцыяй: кожны навучэнец мае вызначаны даследчы патэнцыял, вучэбна-даследчая работа дапаможа яму наблізіцца да разумення навуковай карціны свету, стаць таленавітай, творчай асобай. Менавіта метад праектаў і забяспечвае сістэмнасць, комплекснасць у навучанні і разам з тым ён накіраваны на індывідуалізацыю ў засваенні і прымяненні ведаў. У сваёй педагагічнай дзейнасці прытрымліваюся і раздзяляю пункт погляду К.С. Полат, якая вызначае гэту тэхналогію “как совокупность приемов, позволяющих в определенной их последовательности реализовать данный метод на практике” і выкарыстоўваю наступнае азначэнне: “Метод проекта – это инновационная технология обучения, при которой обучающиеся приобретают новые знания в процессе поэтапного, самостоятельного/под руководством учителя планирования, разработки, выполнения усложняющихся заданий” [2].

Для таго, каб авалодаць метадам праектаў, неабходна ведаць, што праекты могуць быць рознымі. У сваёй рабоце я прытрымліваюся даследчага праекта. Менавіта ён па структуры нагадвае навуковае даследаванне. Уключае абгрунтаванне актуальнасці выбранай тэмы, вызначэнне задач даследавання, абавязковае вылучэнне гіпотэзы, абмеркаванне атрыманых вынікаў.

Пры выкарыстанні метаду праектаў абавязкова ўлічваю наяўнасць значымай у даследчым творчым плане праблемы/задачы, якая патрабуе даследчага пошуку для яе вырашэння, маецца на ўвазе тэарэтычная, пазнавальная, практычная каштоўнасць мяркуемых вынікаў. Неабходна выраз-

на, зразумела структурызаваць пошукава-даследчую дзейнасць навучэнца або даследчай групы і выкананне зместавай часткі праекта (з указаннем паэтапных вынікаў).

Вызначаючы праблему і задачы даследавання, часта выкарыстоўваю прыёмы “мазгавы штурм” і наладжваю “круглы стол”. Затым выразна фармулюю гіпотэзу, абмяркоўваю метады даследавання. Пасля даюцца канкрэтныя заданні па зборы і сістэматызацыі матэрыялу, прапаноўваю алгарытм аналізу атрыманых даных. Пры гэтым абавязковым з’яўляецца дэманстрацыя ўзораў афармлення канчатковых вынікаў.

У практыцы работы з навучэнцамі I і II курсаў (10 і 11 класы) для мяне самым дзейсным вынікам работы выкарыстання метада праекта з’яўляецца рэзультатыўны ўдзел маіх навучэнцаў у навукова-даследчых канферэнцыях – формы прэзентацыі даследчай дзейнасці. І звязана гэта найперш з развіццём у навучэнцаў навыкаў самастойнай, пошукавай і творчай работы.

Вынікі гавораць самі за сябе. За апошнія гады ў скарбонцы навучэнцаў Баранавіцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя машынабудавання дыпломы і пахвальныя лісты як рэгіянальных і абласных, так і рэспубліканскіх конкурсаў і праектаў (гл. табліцу).

**Рэзультатыўнасць праектаў і даследаванняў, якія выкананы навучэнцамі за апошнія тры гады**

| Курс | Форма творчай работы | Тэма работы | Вынік |
|---|---|---|---|
| I курс | Абласная навукова-практычная канферэнцыя “Зямля, дзе пачаўся мой лёс“ | “Абужэнне нацыянальнай самасвядомасці на прыкладзе празаічных твораў У. Караткевіча” | Дыплом II ступені |
| II курс | Абласная навукова-практычная канферэнцыя «С наукой в будущее» | “Жаргонная лексіка ў мове сучаснай моладзі” | Дыплом III ступені |
| II курс | Рэспубліканскі маладзёвы марафон “Диалог культур – единый мир” (намінацыя “Даследчыя праекты”) | “Вызначэнне нацыянальных і моўных асаблівасцяў сучасных прозвішчаў з мэтай іх класіфікацыі, як спецыфікі нацыянальнага моўнага каларыту” | Пахвальны ліст |
| II курс | Абласная навукова-практычная канферэнцыя “С наукой в будущее” | “Вызначэнне нацыянальных адметнасцей антрапаніміі Баранавіцкага рэгіёну ў кантэксце беларускай анамастыкі” | Дыплом II ступені |
| I курс | Абласны інтэрактыўны праект “Рэцытацыя – 2019” | “Я з той краіны, дзе песню новую да небакраю нясе маладосць на шляхах вясновых” | Дыплом II ступені |





Вельмі важна выявіць усіх, хто цікавіцца рознымі галінамі навукі, дапамагчы ажыццявіць планы і мары, вывесці навучэнцаў на шлях пошуку і дапамагчы найбольш поўна раскрыць свае здольнасці. Для гэтай мэты ў нашым ліцэі мною праводзяцца факультатыўныя заняткі “Малады даследчык”. Галоўная мая задача на гэтых занятках – даць магчымасць навучэнцу раскрыць свой інтэлект у самастойнай творчай дзейнасці з улікам яго індывідуальных асаблівасцей і схільнасцей. Пры гэтым існуе галоўнае правіла ўдзелу ў навукова-даследчай дзейнасці навучэнцаў – ніякага прымусу, толькі асабістая зацікаўленасць і інтарэс.

Накапіўшы вопыт выкарыстання дадзенага метаду, мае навучэнцы змогуць ў далейшым паспяхова здаць выпускныя экзамены, заняць годнае месца ў грамадстве, таму што на належным узроўні будуць валодаць усімі ключавымі кампетэнцыямі (камунікатыўнай, культуразнаўчай, інфармацыйнай, даследчай).

Такім чынам, развіццё даследчых і творчых здольнасцей навучэнцаў, фарміраванне іх уменняў і кампетэнцый пры падрыхтоўцы да конкурсу даследчых работ (канферэнцыі) лічу надзвычай важнай. Напісанне навуковага тэксту развівае ў навучэнцаў даследчую культуру лагічнага і аналітычнага мыслення, а яго публічная прэзентацыя і абарона спрыяе фарміраванню камунікатыўных уменняў прамаўлення і вядзення дыскусіі. Уласны вопыт паказвае, што ў навучэнцаў, удзельнікаў даследчых праектаў, з’яўляецца пастаяннае і ўстойлівае імкненне да самаразвіцця, набыцця адпаведных кампетэнцый, ведаў і творчасці.

Абапіраючыся на ранейшы вопыт выкарыстання ў сваёй прафесійнай дзейнасці іншых педагагічных тэхналогій, прыйшла да высновы, што ў падлеткавым ўзросце менавіта неабходна выкарыстоўваць метад праектнага навучання. У большасці навучэнцаў I курса на пачатак навучальнага года назіраецца нізкі ўзровень матывацыі вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў, у тым ліку беларускай мовы і літаратуры; навучэнцы I курса не прывучаны ў базавай школе да чытання мастацкай літаратуры; у іх не сфарміраваны камунікатыўныя якасці, яны не могуць фармуляваць мэты, граматна прызентаваць вынікі работы. А работа над праектам, пабудаваная на даверы, перакананні навучэнцаў у тым, што ў іх усё атрымаецца, садзейнічае паспяховасці, павышэнню матывацыі да вывучэння прадмета.

Праектная дзейнасць (праекты, рэалізаваныя сумесна з навучэнцамі) становіцца сёння неад’емнай часткай вучэбнага працэсу, таму што яна з’яўляецца асобасна- і практыка-арыентаванай, што поўнасцю адпавядае патрабаванням да прафесіянальнай школы Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі [1]. Сучасным навучэнцам проста неабходна ведаць, для чаго, дзе і як яны могуць прымяніць у далейшым свае веды.





Зыходзячы з патрабаванняў, якія прад’яўляюцца на сучасным этапе да якасці і зместу выкладання, цалкам абгрунтавана прымяненне такіх сродкаў і тэхналогій навучання, якія прадугледжваюць самастойную, даследчую работу навучэнцаў. Менавіта такі характар носіць метад праектнай дзейнасці.

Практычная значнасць большасці праектаў дазваляе рыхтаваць падлеткаў да жыцця ў соцыуме, садзейнічае выхаванню прафесійна значымых якасцей асобы. Маніторынг якасці ведаў сведчыць аб тым, што навучэнцы, якія прымаюць удзел у падрыхтоўцы праекта, у значнай ступені мяняюць погляд і адносіны да беларускай мовы і літаратуры. Аналіз метаду праектнай дзейнасці з пункту гледжання аптымальнасці яго выкарыстання для рэалізацыі мэт і задач навучання беларускай мове і літаратуры на сучасным этапе ва ўмовах нашай навучальнай установы сведчыць аб эфектыўнасці данага метаду ў дасягненні канчатковай мэты адукацыі – развіцця асобы.

Прааналізаваўшы назапашаны вопыт, раблю выснову: сама тэхналогія (працэс дзейнасці) дае магчымасць для ўдасканалення методыкі яе правядзення. Менавіта праектная методыка дапамагае навучэнцам усвядоміць ролю ведаў, зразумець, што яны становяцца сродкам у навучанні. На занятках, арганізаваных па праектнай тэхналогіі, не бывае, як правіла, праблем з дысцыплінай, бо ў дзяцей проста няма часу на свавольствы. Вучэбны занятак для навучэнцаў – гэта сорак пяць хвілін напружанай практычнай работы.

Такім чынам, праектная дзейнасць – адзін з лепшых спосабаў для сумяшчэння сучасных інфармацыйных тэхналогій, асобасна-арыентаванага навучання і самастойнай працы. Менавіта выкарыстанне метаду праектаў у арганізацыі даследчай дзейнасці гарантуе кожнаму навучэнцу засваенне адукацыйнага стандарта і прасоўванне на больш высокі ўзровень навучання (якасць). У дзяцей паляпшаюцца веды, з’яўляецца інтарэс да прадмета і ўдзелу ў алімпіядным руху і навукова-практычных канферэнцыях. Выкарыстанне метаду праектаў у педагагічнай дзейнасці дапаможа кожнаму педагогу падрыхтаваць выпускнікоў у шырокім сэнсе гэтага слова.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13.01.2011 № 243-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. 17.01.2011. № 2/1795.

2. Новые педагогические информационные технологии в системе образования / Е.С. Полат [и др.] ; под ред. Е.С. Полат. М. : Академия, 1999. 224 с.